педагогікі, але і па гісторыі мастацтва, фарміраваць уяўленні аб важнейшых тэндэнцыях у існаванні земных цывілізацый.

Трохгадовы вопыт выкладання гісторыі педагогікі ў кантэксце гісторыі сусветнай мастацкай культуры дазволіў скласці асноўны алгарытм размеркавання вучэбнага матэрыялу і вызначыць шэраг дзейсных прыёмаў яго выкарыстання.

Перш-наперш высветлілася, што амаль усе студэнты маюць вельмі цьмяныя ўяўленні аб агульнакультурных тэндэнцыях сусветнай гісторыі, не перыядызацыі і месцы той ці іншай эпохі ў агульным струмені часу. Давялося пачынаць кожную лекцыю з разглядання ўмоўнай "лініі часу" і высвятлення месца, якое займае на ёй разглядаемая эпоха (напрыклад, сярэднявечча ў Заходняй Еўропе і на Русі, эпоха Асветніцтва і г.д.).

Наступнае пытанне - сацыяльныя і прыродна-геаграфічныя ўмовы існавання грамадства, якія вызначаюць спосаб жыцця сям'і і асобы. Тут вельмі карыснымі з'яўляюцца творы літаратуры і выяўленчага мастацтва, якія адлюстроўваюць быт і звычаі вывучаемай эпохі. Гэта могуць быць як творы сучаснікаў, так і пазнейшыя рэканструкцыі. Напрыклад, жыццё першабытнага чалавека знайшло адлюстраванне ў палотнах шэрагу мастакоў XX ст.; абрад пасвячэння ў дарослых апісаны ў навукова-папулярных кнігах для падлеткаў. У прыватнасці, аб тым, як гэта магло адбывацца на тэрыторыі Беларусі, піша сучасны археолаг М.Чарняўскі ў кнізе "Вогнепаклоннікі".

Трэці блок інфармацыі тычыцца ўзроўню развіцця навукі і тэхнікі ў пэўную эпоху, напрыклад асаблівасцей пісьма (піктаграмы, іерогліфы, клінапіс), уяўленняў аб будове сусвету і г.д. Зараз для асвятлення гэтых пытанняў часцей за ўсё даводзіцца карыстацца кніжнай ілюстрацыяй, але ў далейшым хацелася б мець кіна-і відэафрагменты.

Чацвёрты блок - вядучыя тэндэнцыі ў працэсе развіцця мастацтва вывучаемай эпохі. Візуальныя і аўдыеілюстрацыі падбіраюцца з ліку найбольш знаёмых, тых, што пазнаюцца "з першага погляду" і першых гукаў.

Наступная інфармацыя паказвае адносіны грамадства да феномена дзяцінства: узроставая перыядызацыя, дзіцячыя вобразы ў мастацтве, з'явы матэрыяльнай і мастацкай культуры і ўвогуле дасягненні цывілізацыі, адрасаваныя дзецям. Пошук ілюстрацый да гэтага блока з'яўляецца найбольш складаным, але і найбольш прадуктыўным этапам падрыхтоўкі лекцыі. Вялікую цікавасць да такіх матэрыялаў праяўляюць студэнты. Некаторыя з іх выбіраюць адпаведныя тэмы курсавых работ па педагогіцы. Так, паспяхова былі абаронены работы на тэмах "Дзіцячыя вобразы ў мастацтве заходнееўрапейскага сярэднявечча", "Вобразы дзяцінства ў выяўленчым мастацтве італьянскага Адраджэння", "Творы заходнееўрапейскіх кампазітараў другой паловы XIX ст., адрасаваныя дзецям-слухачам і дзецям-выканаўцам". Значная частка сабраных студэнтамі матэрыялаў выкарыстоўваецца ў лекцыях.

Шосты блок адлюстроўвае характар мэт выхавання, пануючых у кожную гістарычную эпоху ў грамадстве. Вельмі выразным з'яўляецца тут спалучэнне візуальнай і тэкставай інфармацыі. І тая, і другая павінны быць сапраўднымі "дакументамі эпохі". Напрыклад, "Павучэнне пісца Хеці свайму сыну" асабліва выразна гучыць на фоне роспісаў і рэльефаў са старажытнаегіпецкіх пірамід, а "Павучэнне Уладзіміра Манамаха" - у спалучэнні з малюнкамі са старажытнаславянскіх летапісаў.

Апошні блок пытанняў - персаналіі знакамітых педагогаў эпохі. На жаль, няшмат партрэтаў гэтых дзеячаў па ўзроўню выканання могуць лічыцца высокамастацкімі, але іх творы, жыццё, ідэі натхнілі мастакоў-ілюстратараў на стварэнне маляўнічых выданняў, а таксама з'явіліся падставай да шэрагу экранізацый. Такім чынам, апошні блок інфармацыі можа быць ілюстраваны як аўтарскімі і прыжыццёвымі выданнямі (Скарына, Каменскі), так і больш позняй кніжнай графікай і фільмаграфіяй.

Выкладанне гісторыі педагогікі ў адпаведнасці з апісаным алгарытмам спалучае вобразную і інтэлектуальную, візуальную і слыхавую інфармацыю і, на наш погляд, у найбольшай ступені адпавядае псіхалагічным асаблівасцям студэнтаў-культуролагаў.

Аменькоў А.А.,
канд.псіхал.навук,
дацэнт

## АБ РАЗВІЦЦІ ПСІХАЛАГІЧНАЙ КУЛЬТУРЫ ЧАЛАВЕКА

Паняцце развіцця любога псіхалагічнага феномена патрабуе вылучэння яго асноўных структурных і змястоўных характарыстык, якія і выступаюць крытэрыямі развіцця. Так, каб раз-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

важаць аб развіцці псіхалагічнай культуры,неабходна даць падрабязны аналіз гэтага складанага феномена.

Па-першае, псіхалагічная культура чалавека прадугледжвае дакладнае валоданне ім сістэмай адпаведных ведаў у якой-небудзь сферы дзейнасці (медыцына, тэхніка, эканоміка, палітыка і г.д.). Гэта сістэма ведаў забяспечвае яму эфектыўную дзейнасць. Мы не можым сведчыць аб высокім узроўні псіхалагічнай культуры чалавека, які добра авалодаў тэхнічнымі ведамі або ведамі і ўменнямі кіравання заводам ці калгасам, а бярэцца за палітыку, кіраванне дзяржавай і робіць гэта неэфектыўна.

Па-другое, псіхалагічная культура чалавека характарызуецца ўзроўнем разумення таго, як свядома засвойваць веды, асэнсоўваць магчымасці ўспрымання, памяці, мыслення, уяўленняў пры засваенні ведаў, разумець і вывучаць магчымасці сваёй эмацыянальна-валявой сферы, індывідуальна-псіхалагічных асаблівасцей развіцця. Неабходна адзначыць, што веды і ўменні павінны быць не дагматычнымі, яны павінны змяняцца, развівацца, трансфармавацца і не стрымліваць развіццё чалавека.

Па-трэцяе, псіхалагічная культура вызначаецца ўзроўнем самасвядомасці. Кожны чалавек выдзяляе сябе з іншых і пэўным чынам супрацьпастаўляе сябе ім. Гэта адзін з вядучых механізмаў псіхічнага развіцця асобы, і тое,як вырашаецца супярэчнасць паміж выдзяленнем сябе і супрацьпастаўленнем другім людзям, сведчыць аб узроўні псіхалагічнай культуры чалавека. Неабходна ведаць аб накіраванасці супрацьпастаўлення чалавека іншым людзям. Па накіраванасці супрацьпастаўленне можна класіфікаваць па-рознаму, але з пазіцыі аналізу развіцця псіхалагічнай культуры гэты механізм можа развівацца штучна і натуральна.

Пры штучнай арганізацыі гэтага механізму развіцця ствараюцца супярэчнасці паміж людзьмі, якія адпавядаюць, як правіла, ідэалагічным задачам і, галоўнае, не ствараюць сацыяльнай сітуацыі псіхічнага развіцця асобы, стрымліваюць развіццё псіхалагічнай культуры чалавека.

Пры натуральным развіцці механізму выдзялення асобай сябе з іншых і супрацьпастаўлення сябе ім, як правіла, ствараецца сацыяльная сітуацыя псіхічнага развіцця, фарміруюцца самаацэнка і пэўны ўзровень дамаганняў, развіваюцца механізмы нацыянальнай свядомасці, прафесійнай ідэнтыфікацыі і іншыя псіхічныя ўтварэнні, якія абумоўліваюць развіццё псіхалагічнай культуры чалавека. Дарэчы, можна зазначыць, што барацьба асобнай часткі людзей за ўвядзенне двухмоўя на Беларусі гэта і ёсць стварэнне штучнай супярэчнасці, якая вядзе да канфрантацыі людзей, не стварае ўмовы для развіцця іх псіхалагічнай культуры.Натуральным з'яўляецца свядомае выдзяленне асобай сябе як часткі гэтай зямлі, як прадстаўніка асобнай, але не адменнай супольнасці людзей, у якіх мэта - захаваць свае гістарычныя карані, жыць па законах гэтай зямлі і прыроды, дбаць аб будучым гэтай зямлі і сваіх нашчадкаў.

Сродкам фарміравання нацыянальнай свядомасці з'яўляецца мова. Характэрнымі рысамі праяўлення нацыянальнай свядомасці можна назваць памяркоўнасць, вялікую цярплівасць, паслядоўнасць і настойлівасць. Гэтыя рысы многія лічаць характарыстыкамі псіхалагічнай культуры беларусаў.

Па-чацвертае, псіхалагічную культуру чалавека вызначае сістэма яго адносін да сябе, іншых людзей і да рэчаіснасці. Чым шырэй гэта сістэма адносін, тым больш магчымасцей для развіцця псіхалагічнай культуры чалавека. Асаблівае месца ў сістэме адносін чалавека займаюць адносіны да сябе. Пачуцці самапавагі, годнасці, выключнасці, адэкватная самаацэнка і ўзровень дамаганняў асобы робяць чалавека псіхалагічна культурным.

Усе характарыстыкі адносін чалавека да сябе фарміруюцца ў рэфлексійна-перцэпцыйнай дзейнасці, а гэта азначае, што ўзровень сфарміраванасці гэтай дзейнасці можна лічыць важным паказчыкам развіцця псіхалагічнай культуры чалавека.

У сістэме міжасобасных зносін паказчыкамі псіхалагічнай культуры чалавека з'яўляюцца не столькі яго статус, колькі дабрабыт яго зносін, іх маральная накіраванасць і матывацыя, здольнасць чалавека прагназаваць свае адносіны, уменне будаваць аптымальныя зносіны, аказваць дапамогу і прымаць яе ад іншых людзей, быць добразычлівым, прыязным у адносінах.

Адносіны чалавека да рэчаіснасці таксама маюць сваю структуру. У кожнага чалавека па-рознаму суадносяцца палітычныя, ідэалагічныя, эканамічныя, вытворчыя, рэлігійныя, прававыя, сямейныя і іншыя адносіны. Сістэмнасць і адносная ўстойлівасць іерархіі гэтых адносін можа выступаць паказчыкам псіхалагічнай культуры чалавека.

Па-пятае, аб псіхалагічнай культуры чалавека можна меркаваць па наяўнасці ў яго мэтанакіраванай дзейнасці.

Адзначаныя характарыстыкі псіхалагічнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУИР

культуры сведчаць аб тым, што гэты феномен вельмі складаны. Можна дапусціць думку, што псіхалагічная культура ёсць інтэграцыя ўнутраных псіхалагічных і знешніх сацыяльных з'яў, якая праяўляецца ў жыцці чалавека ў адпаведнасці з яго свядомасцю. Гэта праяўленне складаецца з трох кампанентаў: эмацыянальнага, гнастычнага і паводзін.

І далей, калі лічыць, што ў аснове разумення культуры стаіць чалавек, то псіхалагічная культура асобы ляжыць ў аснове культуры чалавека ў цэлым.

Прапанаваны падыход дазваляе на прагматычным узроўні займацца мэтанакіраваным развіццём псіхалагічнай культуры чалавека.

Алпі-Селязнёў І.Ф.,
докт.філас.навук,
дацэнт
Казак В.В.,
выкладчык БДПА

## КАНЦЭПЦЫЯ МАСТАЦКА-ЭСТЭТЫЧНАЙ АДУКАЦЫІ Ў СІСТЭМЕ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ БЕЛАРУСІ

У час адраджэння нацыянальнай культуры перад беларускім народам стаяць важнейшыя задачы нацыянальнага духоўна-культурнага, сацыяльна-эканамічнага, навукова-тэхнічнага прагрэсу. Іх вырашэнне залежыць ад стварэння сучаснай мадэлі бесперапыннай адукацыі на аснове якаснага пераўтварэння ўсяго навучальна-выхаваўчага працэсу. Для гэтага неабходна наступнае.

1. Аб'ектыўна-гістарычнае прызнанне і сцвярджэнне фундаментальнай ролі мастацка-эстэтычнай культуры ў сістэме адукацыі, уключаючы развіццё, выхаванне і навучанне асобы.

2. Сацыяльна-каштоўнаснае прагназіраванне зместу прадметаў мастацка-эстэтычнага цыкла на аснове нацыянальнай беларускай культуры і агульначалавечых сусветных прыярытэтных вартасцей з улікам заканамернасцей мастацка-эстэтычнага развіцця асобы.

3. Дыялектыка-творчае вырашэнне існуючых супярэчнасцей і пошук гарманічна сінтэзаваных суадносін мастацтва і навукі як дзвюх палярных форм (сродкаў, метадаў) развіцця цэласнага, гарманічнага, універсальнага чалавека.

З улікам гэтага выкладчыкам неабходна мець выразнае ўяўленне па наступных пытаннях:

1. Суадносіны цыкла прадметаў мастацтва і навукі ў навучальна-выхаваўчым працэсе павінны вызначацца разумнай мерай і гармоніяй, таму што пры іх узаемадзеянні нараджаецца новы прадукт чалавечай думкі - сінтэзаванае пазнанне і адлюстраванне, якія з'яўляюцца фундаментальнай асновай развіцця любой творча-пераўтваральнай дзейнасці (гэта раскрываецца на мадэлі школы "Універсум").

2. Працэс сінтэзацыі мастацтва і навукі сацыяльна і прыродна аб'ектыўны, дзякуючы асобай уласцівасці руху матэрыі ("уласцівасць поліпараметрызму") і яго спецыфічнага праяўлення праз "закон свабод(ы)насці параметраў" (ЗСП). ЗСП аб'ектывіруе развіццё асобы пры варыянтна-творчым, мастацка-эстэтычным асваенні рэчаіснасці, стварэнні духоўных, інтэлектуальных і матэрыяльных вартасцей.

3. Духоўная культура чалавека абапіраецца на эмацыянальную і сенсорную культуру праз з'яву "катарсісу" - ад суперажывання да ўзрушэння адкрыцця. Важнейшымі задачамі мастацка-эстэтычнай адукацыі з'яўляюцца: фарміраванне мастацкага ўспрымання, выхаванне пачуццяў, талерантнасці ацэнак агульнай культуры (і рэлігіі) асобы, развіццё сенсорных здольнасцей, вобразнага мыслення, творчай дзейнасці.

4. Працэс адукацыі і выхавання мастацка-эстэтычнымі сродкамі ўяўляецца цэласнай і паслядоўнай сістэмай развіцця культуры мастацкага творчага мыслення пры засваенні моў мастацтва. Пры такім падыходзе раскрываюцца міжпрадметныя сувязі, таму што пры своеасаблівасці вобразных сродкаў агульныя заканамернасці мастацкага мыслення і культуры ў цэлым адзіныя.

Сучасны стан школы сацыяльна небяспечны. Мастацка-эстэтычная культура і адпаведна нацыянальная беларуская культура, мастацтва ў сістэме адукацыі выступаюць як прымат у агульным навучальна-выхаваўчым працэсе, хоць яны павінны стаць фундаментальнымі, таму што чалавек "навуковы" ёсць працяг чалавека "мастацкага". Іменна мастацка-эстэтычная дзейнасць з'яўляецца важнейшай формай самавыяўлення чалавека і адзінай формай адлюстравання духоўнага жыцця.